**Касцень, А.** І выкляты той перавал / А. Касцень // Пастаўскі край. — 1992. — 25 крас. — С. 2.

# І ВЫКЛЯТЫ ТОЙ ПЕРАВАЛ

Хутка тры гады, як закончыліся для Аляксандра Касцюкевіча вайсковыя дарогі. Пасля вываду савецкіх войскаў з Афганістана некалькі месяцаў яшчэ даслужваў у Баку. А вярнуўшыся дадому, занятак па душы найшоў. Сям'ю завёў, сын расце. Але Афганістан працягвае жыць у чалавеку неадступна. Гэтага можна і не заўважыць, калі не ведаеш старонкі біяграфіі маладога чалавека. А ведаеш, прыгледзішся, дык і стрыманасць нейкая своеасаблівая, і ў вачах насцярога, трывожнае чаканне… Як тады, на дарогах і перавалах чужой краіны, дзе з-за кожнай скалы можна было чакаць выстралу з гранатамёта ва ўпор або чаргі з кулямёта па кабіне грузавіка.

Шмат было гэтых перавалаў, шмат баёў і кароткіх сутычак, дзе воінам-вадзіцелям, у тым ліку і Аляксандру Касцюкевічу, даводзілася станавіцца стралкамі, адбівацца ад нападзення сваімі сіламі. І асабліва памятны, выкляты і ім, і яго сябрамі, Айдак недалёка ад сумна славутага ў той ужо мінулай вайне Хайратона. Там страціў земляка Сяргея Клянцэвіча з Гродна, там многія сябры былі паранены, сталі калекамі.

Магчыма, за той бой, а, магчыма, і за іншы – сёння цяжка ўстанавіць – і было паслана на салдата прадстаўленне. І вось праз тры гады ўрадавая ўзнагарода знайшла былога афганца. Ён удастоены медаля «За адвагу» – вышэй якога сярод медалёў і няма. А ў тым, што ўрада таго і дзяржавы, чыя гэта ўзнагарода, ужо няма, што сама вайна прызнана несправядлівай і памылковай – віна не салдата. Ён свой абавязак выканаў чэсна. Працуе цяпер у родных Лынтупах, будуе жыллё, не ад якой-небудзь арганізацыі, а ў суполцы з такімі ж майстрамі, вольнымі мулярамі і цeслярамі.

– Аляксандр, а ці ведаеш, якія льготы табе належаць як афганцу, а цяпер і афганцу, адзначанаму ўзнагародай?

– Не цікавіўся асабліва. Вось з Лынтуп прыехаў бясплатна, па пасведчанні. І на гэтым дзякуй.

Урэшце, пра льготы ў райваенкамаце Касцюкевічу расказалі ўсё неабходнае. Ваенком, уручыўшы ўзнагароду, пажадаў яму найперш здароўя і вытрымкі.

А вайна? Яна не адступіць, будзе і будзе напамінаць аб сабе трывожнымі снамі, балючай памяццю аб сябрах. На тое яна і вайна.

**А. Касцень**